

# «ОЙ, ТРОЙЦА, СЬВЯТАЯ БАГАРОДЗІЦА, ХТО ПАСЕЕЎ – УСЁ ХАЙ ЗАРОДЗІЦЦА»

## Традыцыі святкавання Сёмухі ў беларусаў



**Таццяна Кухаронак,**
старшы навуковы супрацоўнік аддзела нарадазнаўства Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

Традыцыйныя каляндарныя святы беларусаў – найважнейшая сфера жыццядзейнасці нашага народа. Каляндарна-абрадавы комплекс выступае адным з найважнейшых чыннікаў, што ўплывае на вызначэнне ідэнтычнасці народа і ўключэнне ў прастору народнай культуры. Святы разгортваюцца на аснове духоўных сувязяў паміж людзьмі і спрыяюць фарміраванню адчування гармоніі быцця, дэманструюць жыццесцвярджальны характар народнага светаразумення. Кожнае з каляндарна-абрадавых святаў мае разгалінаванае мастацкае афармленне і абуджае эмацыйныя перажыванні ўдзельнікаў, што пацвярджае яго каштоўнасна-ідэалагічнае значэнне ў грамадстве. Першапачатковы сакральны сэнс абраду трансфармуецца ў вобразна-паэтычную форму калектыўных дзеянняў, якія прайграюцца кожным наступным пакаленнем [1].

Артыкул падрыхтаваны з увядзеннем у навуковы ўжытак новых палявых матэрыялаў, запісаных у экспедыцыях у апошнія дзесяцігоддзі. У адных выпадках аповеды носьбітаў традыцый даюць уяўленне аб стане абрадавай практыкі пасляваеннага і зрэдку даваеннага часу, у іншых – абрады зафіксаваныя ў рэканструяваным выглядзе ці ў жывым бытаванні.

У народным календары беларусаў вядома завяршальнае веснавое свята ў гонар заканчэння ўсіх веснавых палявых работ – Сёмуха (Тройца, Сё(–я)мік, Зялёныя Святкі/Свёнткі, Зелянец, Духа, Духаў дзень, Сёмка), аснову якога ў старажытнасці складалі культ расліннасці і культ продкаў. Пасля прыняцця ўсходнімі славянамі хрысціянства

прымеркавана ў праваслаўных да свята ў гонар Святой Троіцы (у каталікаў – Спаслання Святога Духа на Апосталаў), якое адзначаецца на пяцідзясяты дзень пасля Пасхі (г.зн. на сёмым тыдні – адсюль і назва Сёмуха). У Новым запавеце расказваецца, што на 50-ты дзень пасля ўваскрэсення Хрыста апосталы сабраліся разам, як ім было загадана Сынам Божым. Пачуўся шум, якім суправаджалася сашэсце на апосталаў Святога духа ў выглядзе вогненных языкоў. У свяшчэнным дзействе прымалі ўдзел усе тры іпастасі Боскай Троіцы: Бог-бацька, Бог-сын, Бог-Святы дух. Адсюль і бярэ сваю назву вялікае хрысціянскае свята Троіца.

Сёмушны/траецкі тыдзень – невялічкая перадышка ад клапатлівых веснавых сельскагаспадарчых работ. Да Тройцы стараліся папалоць усе грады, бо, паводле ўяўленняў носьбітаў традыцый, тады трава там расці не будзе. Наогул, да Сёмухі вяскоўцы імкнуліся выканаць асноўныя веснавыя сельскагаспадарчыя работы, бо на працягу ўсіх святочных дзён існавала строгая забарона на працу. У мінулым свята доўжылася тры-чатыры дні, у сучасны перыяд гэты тэрмін скарачаецца да аднаго-двух дзён. Па значнасці і ўрачыстасці Сёмуха ў свядомасці носьбітаў традыцый прыраўноўваецца да Вялікадня. У сельскай мясцовасці Беларусі свята было шырока распаўсюджана і мела лакальныя асаблівасці правядзення. Напярэдадні кожная сям'я старанна рыхтавалася да яго, прыбіраўся двор, гаспадарчыя пабудовы, хата.

Асноўны сэнс урачыстасцяў – ушанаванне расліннасці, зеляніны, кветак, дрэў. Упадабанымі дрэвамі беларусаў з'яўляліся бяроза і клён, якія займалі цэнтральнае месца ў сёмушнай абраднасці і звычаёвасці. Час святкавання Сёмухі (канец вясны – пачатак лета) супадаў з перыядам актыўнага росту раслін, таму і ўпрыгожвалі хаты, гаспадарчыя пабудовы, жытнёвыя палі галінкамі дрэў, якія, паводле народных уяўленняў, спрыялі ўрадлівасці зямлі і выспяванню збажыны, давалі такую неабходную ў гэты час вільгаць. «Украшалі хаты зелянню, клёнам. Мае дзеўкі дак у кожную дзірку напіхалі. Абязацельна нада над кароўнікам, над сьвінушнікам, дзе пціца, уваходныя <дзверы>. На вароты, каторыя ў двор заходзяць і каторыя ў хату. У нас гавораць: “Хату ўкрашаю і празьнік сабе ў хату прыглашаю”. Вешаем і гаворым так» (Валянціна Гаўрыленка, 1945 г.н., в. Васілевічы, Жлобінскі раён, Гомельская вобласць).

Прыбраўшы хаты і двары, ішлі ў лес, высякалі маладыя дрэўцы ці голле бярозы, дуба, клёна, ліпы, рабіны, іншай зеляніны і прынесенымі галінкамі аздаблялі сцены і вокны хаты, ікону, а падлогу ўсцілалі аерам, сыпалі яго ў хлявы і іншыя гаспадарчыя пабудовы. Траецкую зеляніну на Беларусі называлі «маем». «На Сёмуху трэба было ісці, бярозкі невялікія высякаць і ставілі ў варотах дзве, ля парога – дзве бярозкі. Эта май называлі. Яер <аер> быў, яер рвалі і ўвесь двор свой усцілалі, і на вуліцы проціў свайго дома, і пол у хаце. Палоў дзеравянных жа не было, мо ў пары чалавек, а так з гліны пол. Паталкі ж былі, бэлькі такія, за іх затыкалі май – ліпу ў нас» (Вера Донь, 1938 г.н., в. Крышылоўшчына, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць). На Віцебшчыне казалі: «Не прыйшло свята ў лес, а лес прыйшоў на свята». Упрыгожвалі зелянінай і калодзеж: «Перад Тройцай ламалі клён і нясьлі ў хату, а ў первую вочарадзь на калодзеж. Апусціш журавель ваду браць і наверх уторкнеш вянок з клёну, тады паднімуць – ён <вянок> навярху» (Антаніна Бардзюгова, 1934 г.н., в. Чырвоны Кут, Веткаўскі раён, Гомельская вобласць). Маладыя бярозкі ставілі ў брамцы, перад ганкам, каля плоту: «Перод Тройцэй сьсякалі бярозкі, прыносілі домой і закопвалі бярозкі под окном. Бероза, кажуть, спасітельніца, зашчышчае от усёго – трэбо, штоб была ў дворы» (Вольга Фіцнер, 1929 г.н., в. Грабяні, Лельчыцкі раён, Гомельская вобласць). Траецкая зеляніна ўспрымалася беларусамі як універсальны абярэг: «Вешалі клён на дзьверы, на вокны, на сарай – ад нячыстай сілы абярог такі быў» (Эма Паўлава, 1938 г.н., в. Старая Рудня, Жлобінскі раён, Гомельская вобласць).

Некаторыя дрэвы лічыліся небяспечнымі: «Асіну не нясуць на Тройцу, толька бярозу. Бярозка харошая дрэва. З асінавых досак нельзя нічога рабіць» (Вера Буцэр, 1933 г.н., в. Галінова, Вілейскі раён, Мінская вобласць).

Паводле вераванняў, траецкай зеляніне надаваліся прадукавальныя магічныя ўласцівасці: рабілі вянкі, насілі на агарод, клалі іх на капусту, на кожную галоўку асобна, каб капуста вялікая расла. Па стане гэтых галінак нашы продкі вызначалі, якім будзе лета і будучы ўраджай: калі яны засыхалі хутка – трэба было чакаць спякотнага лета, а калі доўга не вялі, лета чакалася мокрае.

Траецкую зеляніну не выкідвалі, а праз тры дні збіралі і выкарыстоўвалі на працягу года як дзейсны сродак аховы ад грому, маланкі, хвароб жывёлы, шкодных насякомых, грызуноў і г.д.: «На Духаў дзень нада выкінуць чараз акно клёны, штоб не ўдарыла граза. Мы ж усякай усячыны наламаем, абторкаем хаты, чэраз нядзелю нада выкідаць ілі занасіць нада ў сарай, штоб сена мышы не паелі» (Галіна Брыкава, 1941 г.н., в. Стары Дзедзін, Клімавіцкі раён, Магілёўская вобласць).

Выкарыстоўвалі траецкую зеляніну і ў народнай медыцыне: «А гэту галінку хаваем. Калісьці нарывы былі на пальцах, цяпер жа мазі да ўсё, а тады прылажваюць к пальцу ці к назе, лісцік размочваюць і прылажваюць. Памагая» (Вольга Міхнавец, 1937 г.н., в.Ананьчыцы, Салігорскі раён, Мінская вобласць). Траецкую зеляніну, якая заставалася, часцей за ўсё спальвалі на купальскім вогнішчы.

У шматлікіх месцах Беларусі ў суботу перад Сёмухай спраўлялі памінальныя Дзяды, у першую чаргу паміналі тапельцаў ці самагубцаў увогуле, ахвяравалі хлеб старцам у надзеі на ўспамін душы сваякоў-самагубцаў. Магілкі ўпрыгожвалі «маем» і аерам, абмяталі іх бярозавымі венікамі. Вечарам ладзілі памінальную вячэру ў сям'і: «Перад Сёмухай абязацельна Дзяды рабілі, гатавалі капусту, квас, кашу, рыбу. Капусту квашаную варылі, квас – эта поліўка, укінуў грыбок сушаны, ён паварыўся-паварыўся, тады мукі разбалтаў вадою і заліў. Первы блін лажылі на вокна, першы блін парвалі – і на адно акно, на другое палажылі. Эта дзядом, ляжала цэлую ноч, а ўтрам курам атдавалі. Цяперача раблю Дзяды як дзеці прыедуць, пазвоняць, я гатую этыя стравы» (Любоў Ашмянкевіч, 1940 г.н., в. Руткавічы, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць).

У нядзелю раніцай па-святочнаму апранутыя вяскоўцы ішлі ў царкву (касцёл), дзе асвячалі розныя палявыя і лугавыя зёлкі. У многіх месцах Беларусі гэтыя зёлкі захоўваліся, звязаныя ў пучкі, на гарышчы, іх клалі ў труну, абкурвалі нябожчыка. «На Тройцу, бывала, пойдзем з мамай у лес, яна гаворыць, што нада ж нарваць бабушке травы: Іван-Мар'я, ландышы, каб пасвяцаць. Тады як чалавек умрэць, кладуць іх у падушку» (Раіса Азарава, 1939 г.н., в.Галоўчын, Бялыніцкі раён, Магілёўская вобласць).

Арганічна ўваходзіў у траецкі абрадавы комплекс абрад «завіваць бярозу», які меў шырокае бытаванне на Магілёўшчыне. Тут завівалі бярозкі (плялі ці завівалі галінкі бяроз, радзей іншых дрэў, якія раслі ці былі ссечаны) часцей за ўсё на Духа, а развівалі праз тыдзень. (Ва ўсходніх славян Духавым днём магло называцца як само свята Сашэсця Духа Святога, якое адзначалася ў панядзелак, так і дзень Святой Тройцы, Пяцідзесятніцы). «Тройца сразу, а патом Духа ў панядзелак, но мы счыталі Духа адным днём у васкрасенне. Сабіралісь усім сялом, места ў нас за рэчкаю, мы ўсе ішлі туды атдыхаць, пелі песні, завівалі вянкі ў канцэ ўжо, як пагуляем» (Галіна Брыкава, 1941 г.н., в. Стары Дзедзін, Клімавіцкі раён, Магілёўская вобласць). Канцы галінак адной або некалькіх бяроз згіналі ў кола і замацоўвалі з дапамогай траў, стужак, пры гэтым галінкі часта пераплятаhelp паміж сабой. Асноўнымі выканаўцамі абрадаў на Сёмуху ў беларускай вёсцы мінулага стагоддзя былі дзяўчаты і маладыя жанчыны.



Упрыгажэнне хаты да Сёмухі. Ушацкі раён Віцебскай вобласці. Фота Т. Кухаронак



Аер, раскіданы ў двары. Фота Т. Кухаронак

Месцам для завівання бяроз выбіралі тыя гаі, ляскі, паляны, што знаходзіліся паблізу жытнёвага поля, бо тады, паводле вераванняў, «жыта лепей расце». «Як дзяўчонкі былі, вянкі завівалі на Духа, то на бярёзкі дзе заўем, то бывала хадзілі ў жыта, там заўём» (Зінаіда Зяльковіч, 1937 г.н., в. Родня, Клімавіцкі раён, Магілёўская вобласць). Таксама вілі вянкі непасрэдна з жыта на полі. Абрад «завіваць бярозу» суправаджаўся варажбой на вянках з кветак або бярозавых галінак. Дзяўчаты варажылі ў асноўным пра будучае замужжа, жанчыны – пра свой і сваіх родных лёс: у такім выпадку колькасць вянкоў адпавядала колькасці блізкіх людзей: «Ідзе дзяўчына к бярёзке, завіваець яе, звязывала бярёзку лентачкай і гаворіць: “Суженый, ряженый, еслі мая судзьба с табой сыйцісь – то пусць звязаны вяночак астанецца, а еслі мы разыйдземся – пусць эці ветачкі разыйдуцца”. Усе дзяўчаты так загадавалі: я – на адной бярёзке, другая – на другой» (Зоя Буракова, 1938 г.н., в. Недзьвядзь, Клімавіцкі раён, Магілёўская вобласць). Вілі вянкі з кветак, з гаючых і чарадзейных траў: букавіцы, любісціка, палыну, аеру. Калі вянкі завівалі, дзяўчаты абменьваліся сваім адзеннем, калі ж развівалі – вярталі адзенне адна адной. Вянкі, завітыя на дрэве, абавязкова трэба было праз тыдзень расплесці, каб, згодна з павер’ем, вызваліць дрэва ад пакут і не пашкодзіць свайму здароўю: «Прыкмета такая: калі вянок астанецца не развіты – то будзіць галава балець, будзіць кружэнне ў галаве; а як разаўеш вянок – то будзіць добра табе, цэлы год будзіш здаровай» (Лідзія Саўчанка, 1928 г.н., в. Ліпаўка, Хоцімскі раён, Магілёўская вобласць). Развівалі вянкі і для засцярогі ад русалак: «Вянкі развівалі ў васкрасенне, чараз нядзелю. Гаворaць, у такія празьнікі ведзьмы ходзяць, і нада вянкі развіць абязацельна, а то будзець на іх русалка катацца» (Валянціна Кісялёва, 1939 г.н., в. Родня, Клімавіцкі раён, Магілёўская вобласць).

Агульнавядома, што ў фальклорных творах беларусаў бяроза сімвалізавала дзявочую прыгажосць, прывабнасць, стрыманасць, годнасць. Верагодна, завітая цэлы тыдзень бяроза азначала немагчымасць для дзяўчыны выйсці замуж, таму яны ўвесь гэты тыдзень пазбягалі хлопцаў, мужчын і дзяцей да сваіх таямніц звычайна не дапускалі, бавілі вольны час толькі ў сваёй узроставай групе. Развіванне ж бярозы як бы сімвалізавала вяртанне дазволу дзяўчатам на зносіны з хлопцамі, на падрыхтоўку да шлюбу.

У іншых лакальных традыцыях у гэты дзень вясковыя дзяўчаты «куміліся». Прыйшоўшы ў лес, пачыналі махаць


Аздабленне абразоў да Сёмухі. Клімавіцкі раён Магілёўскай вобласці. Фота Т. Кухаронак


«Хату ўкрашаю, свята запрашаю». Траецкая зеляніна ў куце. Фота Т. Кухаронак


Траецкія бярозкі лічылі абярэгам ад злых сіл. Фота Т. Валодзінай

фартухамі і гойдаць бярозу, каб яе галінкі можна было ўхапіць і звязаць з другой суседняй бярозай. Утварыўшы такім чынам своеасаблівую арку, дзяўчаты-сяброўкі, узяўшыся за рукі, парамі праходзілі пад ёй, спяваючы абрадавыя песні: «Ну-тка, кума, пакумімся!/ Ну-тка, дзеўка, пагалубімся!/ Ты мне кума, а я табе,/ С кумой скуміліся,/ Душа з душою злюбіліся». Пасля «кумлення» ўдзельніцы абрада станавіліся неразлучнымі сяброўкамі на ўвесь год. Уся прынесеная дзяўчатамі ежа раскладвалася вакол адной са сплеценых і ўпрыгожаных стужкамі бярозак, пад якой і распачыналася святочная трапеза.


Абрад "Ваджэнне куста". (www.sb.by)

Часта разам з маладымі жанчынамі і дзяўчатамі ў лес ішла бабуля, якая павінна была ачысціць іх крапівой ад злых духаў. Яна садзілася ў крузе, а дзяўчаты вакол яе вадзілі карагоды; бабуля час ад часу падскоквала і біла дзяўчат крапівою.

У пастухоў былі свае клопаты: каб уратаваць статак кароў ад ваўкоў і паспрыяць яго малочнасці, яны завівалі вянкі з галінак бярозы, клёна, ліпы, іншай зеляніны і надзявалі іх на рогі жывёле («за(–у)квечвалі») кароў. Лічылася, што карова будзе здаровая і даваць шмат малака, калі ў Духаўскую суботу прыйдзе з вянком з поля. Адзін вянок пастух аддаваў вечарам гаспадыні, якая яго высушвала і карысталася як магічным амулетам. За вянок гаспадары адорвалі пастухоў яйкамі, сырам ці іншым падарункам, плацілі грошы. На Віцебшчыне ўважліва назіралі за тым, «якая карова ідзець з поля напярэд з вянком: если чорная – ня будзець пагоды, если красная – будзець харошая пагода».

На Сёмуху ў многіх вёсках і мястэчках Беларусі праводзіліся кірмашы, фэсты. Як правіла, ў гэты дзень не толькі выраашалі гаспадарчыя пытанні – прадавалі, куплялі, але і ладзілі гулянне: «На Духа сабіраемся на базар, туда прывозяць усё, што на свеце ёсць, і ігрушкі дзеревяные і гліняные, і свісткі, і міскі, і гаршкі гліняныя, і гребні, і верецёна, і прялкі, што прядуць. Прадаюць і коней, і кароў, і свінней, і масла, і сала – ой, сколько ўсяго! Можаш і поедаць, і напіцца, і ў двор прынесць. Гармоня на каждам шагу, грают, танцуюць – вон там кумпанія, тут кумпанія і настолько народу много, што мы не можам прыйці друг кала друга. Арелей многа, содзімся на эты арелі, у гору як ляціш харашо, а з гары – душа ў пяткі. На базар з усіх дзяревень сабіраецца маладзёж, парамі пойдуць, знакомілісь дзеўкі с хлопцамі, гулялі» (Кацярына Калініна, 1924 г.н., в. Ляды, Дубровенскі раён, Віцебская вобласць). У некаторых раёнах Мінщчыны кірмашы называліся «піва(–о)», на Гомельшчыне – «залажэньне», «прастольшчына», яны служылі яднанню жыхароў некалькіх пасяленняў: «У нас у дзярэўні кірмаш на Тройцу – з другіх дзеравень усе з'яжджаліся ў госьці. У кожнай хаці госьці, прыгатаўляліся ўсе. Даўней ведалі радню» (Таццяна Лобач,


Абрад "Ваджэнне куста". (www.brama.brestregion.com)


Абрад "Ваджэнне куста". (www.bel.sputnik.by)

1929 г.н., в. Дзмітравічы, Бярэзінскі раён, Мінская вобласць). На траецкіх кірмашах вірылі народныя гулянні, не сканчаліся святочныя застоллі, песні, танцы: «На Тройцу на кірмаш у Месьціна ўсе ішлі, там танцы, клуб – аж грымела ўсё, так танцавалі. Дамоў ідом, развідняя, сонца сьвеціць, а мы чараз раку с танцаў ідом» (Ганна Казачонак, 1931 г.н., в. Чыжаха, Бярэзінскі раён, Мінская вобласць).

Святочны стол быў абавязковым элементам гулянняў, на Тройцу імкнуліся прыгатаваць яечню і юшку са свежай рыбы – калі гулянне ішло на свежым паветры на беразе ракі, возера, на лузе. Апроч вітальнай функцыі застолле несла і важную сацыяльную нагрузку: садзейнічала падтрыманню кроўна-сваяцкіх і суседскіх сувязей у вясковай супольнасці: «Хадзілі ў лес на прыроду, на маёўку. Песьні пелі, танцавалі, весяліліся, калі бутылачку адну возьмуць. Калі які кілішачак выпіў – і пяеш, павесяліліся і ўсё. Ні драк ніякіх, нічога» (Вячаслаў Дарваед, 1925 г.н., в. Ганцаўская Слабада, Лагойскі раён, Мінская вобласць).

У Заходнім Палессі на Тройцу вадзілі «Куста» па ўсіх дварах вёскі, заводзілі яго на агароды, бо «дзе Куста ходзіць, там жытачка родзіць». Дзяўчаты хадзілі з «Кустам», які рабілі наступным чынам: кляновыя, бярозавыя, ліпавыя галінкі звязвалі разам тоўстым канцом, на іх надзявалі іншыя, таксама разам звязаныя галінкі меншых памераў. Выбраная на гэту ролю дзяўчына, рассунуўшы рукамі галінкі, залазіла ў гэты куст, як у мяшок. Галінкі закрывалі яе з галавы да ног. На галаву надзявалі вялікі вянок з розных траў. Абыходзячы з «Кустам» усе сядзібы ў вёсцы, выканаўцы абраду імкнуліся забяспечыць сваім аднавяскоўцам добры ўраджай на ніве, плоднасць статку, здароўе і дабрабыт. Абышоўшы ўсе сядзібы, дзяўчаты ішлі да студні, клалі на яе вялікі кляновы вянок і праз яго даставалі ваду. Гэтай вадой частавалі і аблівалі адзін аднаго. У некаторых вёсках на Міншчыне і Віцебшчыне абыходы аднавяскоўцаў здзяйснялі пераапранутыя маскіраваныя ўдзельнікі. На Сёмуху вадзілі карагоды па вуліцы і па жытнёвым полі: «Ой, Тройца, сьвятая Багародзіца, хто пасееў – усё хай зародзіцца». Вялікае значэнне і шырокае распаўсюджанне на Беларусі атрымалі хрэсныя хады на Сёмуху па вёсцы, на палі, якія мелі асноўную мэту – захаванне ад неўраджаю, засухі і іншых стыхійных бедстваў.

Сёмуха давала асабліва вялікія магчымасці для знаёмства і зближэння моладзі. Адной з форм правядзення вольнага часу падчас свята на Панямонні былі ігрышчы на свежым паветры – «маёўкі». У другой палове дня моладзь збіралася разам у вызначаным месцы (у вёсцы ці за яе межамі). Запальвалі вогнішча, частаваліся прынесенымі стравамі, спявалі, танцавалі, гушкаліся на арэлях. На маёўкі прыходзіла моладзь з іншых вёсак, што пашырала кола знаёмства хлопцаў і дзяўчат, давала больш магчымасцяў для выбару пары.

Сёмуха лічылася сярод вясковых жыхароў спрыяльным часам для заключэння шлюбаў, для вяселляў і стварэння новых маладых сем'яў: «На Тройцу свадзьбы очынь гулялі, бывала, што і пар шэсць-сем у адзін дзень вянчаліся. Тады ўсім танцы, песні, музыка: хто



На Сёмуху. Чэрвеньскі раён Мінскай вобласці. Фота Т. Кухаронак

і ў свадзьбе гуляе, і так маладзёжы, па ўсёй вёсцы гулялі. Цэлую ноч уся вёска аж гудзела, як станаць граць, да спяваць, да танцаваць» (Наталля Кніга, 1938 г.н., в. Мыслава, Слонімскі раён, Гродзенская вобласць).

З панядзелка (Сашэсце Свята Духа) пачынаўся Духаў, або Русальны, Граны, Клячальны, Крывы, Сёмушны тыдзень. Гэты тыдзень беларусы вельмі шанавалі, не пачыналі ніякай новай работы, не пралі, не ткалі, не вілі вяровак, не гарадзілі платоў, каб у гаспадарцы не здарылася якога-небудзь няшчасця. Праўда, на Панямонні адсутнічалі русальныя абрады, як і сам тэрмін «русальны тыдзень». Тут апошняя нядзеля сёмушнага тыдня называлася «Зелянцовай нядзеляй» – у гэты час збіралі зёлкі, якія пасля асвячэння ў храме выкарыстоўвалі ў народнай медыцыне.

**СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ**


1. Гужова И.В. Праздник как феномен культуры в контексте целостного подхода: автореф. дис. … канд. философ.наук: 09.00.13 / И.В. Гужова.– Томск, 2006. С. 3, 14.